# Прывітанне ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б шле палкае большэвіцкае прывітанне Ленінскаму Комуністычнаму Саюзу Моладзі Беларусі ў дзень яго слаўнай пятнаццатай гадавіны.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі комсомол Беларусі ўпісаў герэічныя старонкі ў гісторыю барацьбы працоўных БССР за справу пролетарскай рэволюцыі, за справу соцыялізма. Комсомольцы Беларусі на справе даказалі сваю адданасць партыі на ўсіх участках соцыялістычнай будоўлі і паказалі не мала большэвіцкіх узораў работы. Комсомол Беларусі па праву з'яўляецца гонарам КП(б)Б, яе верным і надзейным рэзервам.

ЛЕНІНСКІ ЦК ВКП(б) І ГЕНІЯЛЬНЫ ПРАВАДЫР ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА ТАВ. СТАЛІН вучылі і вучаць партыю і комсомол з ленінскай напрымірымасцю, з класавай нянавісцю да ворагаў партыі змагацца за генеральную лінію, за чыстату радоў вялікай ВКП(б), за жалезную дысцыпліну, за большэвіцкую манолітнасць і адзінства нашай партыі.

Комсомол павінен і далей змагацца за лінію партыі, так як гэтаму вучыць нас не пераўзойдзены пасля доўца Владзіміра Ільіча, лепшы з лепшых ленінцаў — тав. Сталін. Комсомол абавязан з уласцівай яму энергіяй і класавай нянавісцю яшчэ больш, яшчэ мацней біцца за генеральную лінію нашай слаўнай партыі, за чыстату сцяга Маркса-Леніна-Сталіна, супроць малейшых спроб рэвізаваць генеральную лінію, супроць спроб запляміць гэты баявы, не ведаючы паражэння, сцяг большэвізма.

ТАВ. СТАЛІН ВЫСУНУЎ ЗАДАЧУ дапоўніць пафас нашага будаўніцтва пафасам асваення новых прадпрыемстваў, паставіў задачу аўладання тэхнікай.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН па-большэвіцку змагацца за выкананне промфінплана, за паляпшэнне якасці прадукцыі, за аўладанне тэхнікай, за асваенне новых прадпрыемстваў. ВЫКАНАЦЬ УКАЗАННЕ ПРАВАДЫРА ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА — НЯМА БОЛЬШ ГАНАРОВАЙ ЗАДАЧЫ ДЛЯ КОМСОМОЛА.

ПРАВАДЫР І НАСТАЎНІК НАШАЙ ПАРТЫІ — ТАВ. СТАЛІН ПАСТАВІЎ ЗАДАЧУ ЗРАБІЦЬ УСЕ КАЛГАСЫ БОЛЬШЭВІЦКІМІ, А ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ, ён паставіў задачу павялічыць удвая, утрая выпуск тавараў шырокага спажывання.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН, не спыняючыся на дасягнутых поспехах, яшчэ мацней, яшчэ энергічней у калгасе, у брыгадзе, звяне, на кожным драбнейшым участку работы біцца за выкананне гэтага баявога указання тав. СТАЛІНА. КОМСОМОЛ ПАВІНЕН паказваць прыклад і ўзоры таго, як умеюць комсомольцы пад кіраўніцтвам нашай партыі змагацца за большэвіцкія калгасы, за заможнае, культурнае калгаснае жыццё, за поўную і ў тэрмін здачу ільну, за лепшую арганізацыю зімоўкі жывёлы, за добрага калгаснага каня, за здаровы трактарны парк да веснавой сяўбы.

ЛЕНІН І СТАЛІН ВУЧЫЛІ І ВУЧАЦЬ НАС берагчы як вока заваяванне Окцябра, усямерна ўмацоўваць магутнасць нашай інтэрнацыянальнай, гераічнай, непераможнай Чырвонай арміі, пільна сачыць за святасцю і недатыкальнасцю нашых совецкіх рубяжоў.

КОМСОМОЛ ПАВІНЕН пастаянна быць гатовым ператварыць у жыццё завет тав. СТАЛІНА: «Ні аднэй пядзі чужой зямлі не хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому». Комсомол абавязан, ведучы за сабой шырокую рабоча-калгасную моладзь, аўладаць ваеннай тэхнікай і быць гатовым у любую хвіліну па закліку партыі грудзьмі адстаяць СССР — бацькаўшчыну міжнароднага пролетарыята. Умацоўваць шэфства над морскім і паветраным флотам, над вартавым совецкага пагранічча, быць сапраўды магутным рэзервам РСЧА — пярвейшы абавязак комсомола і кожнага комсомольца.

ГІКАЛО.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі